кругагляд чытачоў, вучыць іх бачыць своеасаблівасць розных відаў мастацтва і спрыяе паляпшэнню эмацыянальнага ўспрымання.

Яшчэ адной комплекснай формай, якая шырока ўкаранілася ў практыку бібліятэк, сталі літаратурна-музычныя гасцёўні. Яны ўяўляюць аб'яднанні чытачоў, злучаных цікавасцю да літаратуры, розных відаў мастацтва. У час іх правядзення адбываецца ўзаемны абмен рознабаковай інфармацыяй.

Такім чынам, бібліятэкі Рэспублікі Беларусь набылі значны арсенал формаў і сродкаў у галіне эстэтычнага выхавання падрастаючага пакалення.

**Дубовік А.А.,**
аспірантка кафедры
бібліятэказнаўства

## ДА ПРАБЛЕМЫ ДЗІЦЯЧАГА НЕЧЫТАННЯ

Супярэчнасці і праблемы, якія за апошнія некалькі гадоў наспелі ў галінах дзіцячай літаратуры і чытання дзяцей, маюць патрэбу ў асэнсаванні іх на высокім навуковым узроўні.

Сітуацыя з чытаннем дзяцей выклікае агульную занепакоенасць, яна з'яўляецца састаўной часткай тых аб'ектыўных падзей, якія адбываюцца ў сучасным грамадстве. На прыметы крызісу дзіцячага чытання наслойваюцца яшчэ і характэрныя менавіта для нашага часу цяжкасці. Так, у пачатку 90-х гадоў расійскія сацыёлагі і навукоўцы канстатавалі факт наяўнасці такой з'явы, як сацыяльная дэпрывацыя — "недастатковасць, недахоп ці наогул пазбаўленне дзіцяці пэўных умоў, неабходных яму для нармальнай жыццядзейнасці і фізічнага, інтэлектуальнага, духоўнага развіцця". Тады ж пачалі гаварыць аб такой жахлівай з'яве нашай рэальнасці, як дэцэлерацыя, што значыць замаруджванне тэмпаў росту і развіцця дзяцей.



Репозиторий БГУКИ

Падзенне прэстыжу чытання сярод як дзяцей, так і дарослых — з'ява сусветная. Назіраюцца яскравыя прыметы крызісу чытання, узнікае асаблівая праслойка насельніцтва — людзі, якіх можна назваць "функцыянальна непісьменнымі".

Мяркуецца, што прычыны гэтага знаходзяцца ў раннім дзяцінстве і бяруць пачатак не толькі ў школьным, але і ў дашкольным перыядзе развіцця асобы дзіцяці. І вырашальную ролю тут маюць сям'я, агульная і чытацкая культура бацькоў. Таму чытацкую сітуацыю абумоўліваюць стыль адносін у сям'і, яе культурныя традыцыі. Менавіта ў сям'і, яе мікрасацыяльным асяроддзі закладзены карані дабрабыту і дрэннага стану дзяцінства. Ад узроўню літаратурнага выхавання, ад пачатковага, стартавага багажу ведаў маленькага чалавека залежыць далейшы яго лёс. Як вядома, цяпер веды і адукацыя становяцца магутнымі рэсурсамі. Чытанне ж заўсёды выступала як першапачатковая крыніца развіцця розуму і маральных якасцей асобы. Існуе непарыўная ўзаемасувязь паміж актыўнасцю чытання і адукацыйным узроўнем.

Акрамя таго, праблема яшчэ больш абвастраецца з-за хуткага развіцця сродкаў мас-медыя, або масавай камунікацыі, якія ўсё больш актыўна ўваходзяць у побыт і выцясняюць з жыцця дзяцей патрэбу чытаць кнігі. Паводле азначэнняў айчынных сацыёлагаў, пад уплывам мас-медыя змяняецца субкультура дзяцінства.

Шэраг праблемных сітуацый стварае і неабходнасць комплекснага сацыялагічнага вывучэння дзіцячага чытання. Вузкія зандажныя даследаванні праводзіліся Кніжнай палатай Беларусі ў 1990 годзе ("Кніга ў жыцці школьнікаў") і Нацыянальнай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь у 1995—1997 гадах ("Структура і дынаміка дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь"). Але гэтыя даследаванні толькі аспектна раскрываюць праблему і адлюстроўваюць далёка не ўсе яе шматлікія і супярэчлівыя грані.

Дзеці — гэта інтэлектуальны капітал кожнай нацыі. Таму дадзеная праблема ў цеснай узаемасувязі з іншымі становіцца дзяржаўнай, першачарговай. Паказальным для нас тут з'яўляецца вопыт замежных краін, якія сутыкнуліся з гэтай праблемай раней за нас і ўжо маюць пэўны вопыт і напрацоўкі па дадзеным пытанні. Да прыкладу, магутныя дзяржаўныя праграмы падтрымкі дзіцячага чытання і кнігавыдання для дзяцей створаны і эфектыўна функцыянуюць каля трыццаці гадоў у Нарвегіі, Польшчы, Славакіі, Францыі і іншых краінах Заходняй Еўропы. У Расіі створана і трэці год дзейнічае праграма "Дзеці Расіі".

У нашай дзяржавы яшчэ наперадзе распрацоўка планаў і праграм, накіраваных на вырашэнне ўказанай праблемы.

**Прадзеіна А.В.,**
аспірантка кафедры
бібліяграфіі і дакументазнаўства

## СІСТЭМА РЭГІЯНАЛЬНЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ДАПАМОЖНІКАЎ: СУЧАСНЫ СТАН, ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

(на прыкладзе абласных універсальных бібліятэк Беларусі)

Абласныя універсальныя навуковыя бібліятэкі Беларусі з'яўляюцца цэнтрамі краязнаўчай бібліяграфічнай дзейнасці ў вобласці (рэгіёне). У адпаведнасці з "Палажэннем аб краязнаўчай рабоце бібліятэк Рэспублікі Беларусь" (1993 г.) яны павінны весці самы поўны і дакладны краязнаўчы даведачна-бібліяграфічны апарат, займацца краязнаўчым бібліяграфічным абслугоўваннем, распаўсюджваць краязнаўчыя веды, фарміраваць сістэму краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і паказальнікаў мясцовых дакументаў, разгляду якой і прысвечаны дадзены артыкул. Становчым момантам з'яўляецца тое, што ў разглядаемым дакуменце ўпершыню паказальнікі мясцовага друку, не звязаныя па змесце з краем, аднесены да статусу краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, аб чым



Рэпазіторый БГУКІ